Аляксандр МАКАРЭВІЧ

# ПРАБЛЕМНАЕ ВЫКЛАДАННЕ ЛІТАРАТУРЫ Ў X—XI КЛАСАХ ПА СІСТЭМЕ ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ ЛІНІЙ

Кожны суб'ект разумовага дзеяння, звяртаючыся да пачатковага этапу адпаведнай дзейнасці, мусіць усвядомліваць перспектывы і вынікі такога звароту. Не сакрэт, што для школьнікаў, асабліва сярэдняй і малодшай ступені, вядучым з'яўляецца прагматычны момант: бліжэйшая адзнака. Назавем яго так: **першая з перспектыўных ліній.** Адна з пачатковых формаў дзейнасці настаўніка на гэтым этапе, калі зыходзіць з сукупнасці алгарытмаў ягоных метадычных дзеянняў,— удакладненне патрабаванняў у нормах ацэнкі вусных выказванняў вучняў і іх пісьмовых работ. Задача ж настаўніка на любым этапе вывучэння творчасці пісьменніка — ствараць умовы пераходу прагматычных памкненняў вучняў у якаснае іх пераўтварэнне: **фармаванне ўменняў і навыкаў бачыць літаратурны вобраз у кантэксце мастацкага твора, мастацкі твор — у кантэксце творчасці пісьменніка, дзейнасць пісьменніка суадносна з творчасцю іншых мастакоў слова, літаратурны працэс пэўнай эпохі — у параўнанні з фактамі літаратурнага жыцця папярэдніх і наступных часоў.**

Істотным у працэсе вывучэння літаратуры для старшакласнікаў з'яўляецца падрыхтоўка да выпускнога экзамену па прадмеце (**сярэдняя перспектыва**). Гэты момант мэтазгодна пастаянна мець на ўвазе настаўніку, каб пры выкладанні канкрэтнай тэмы паралельна рыхтаваць вучняў да адказу на адпаведнае пытанне ў білеце і ствараць перадумовы якаснага набліжэння да галоўнай, як нам думаецца, у сукупнасці перспектыўных, лініі: **успрымаць і асэнсоўваць літаратурны вобраз, твор, творчасць пісьменніка, літаратурную эпоху, зыходзячы з агульначалавечых, гуманістычных уяўленняў аб прыгожым у жыцці і мастацтве.**

Неабходна звярнуць увагу на адзін з істотных момантаў, без якога цяжка здзяйсняць якасны працэс навучання: **наяўнасць каляндарнага перспектыўнага плана работы з дакладна вызначанымі формамі дзейнасці настаўніка і вучняў.** Асноўнымі яго палажэннямі могуць быць наступныя:

1. Агульны колькасны нумар урока.
2. Тэма ўрока.
3. Дата ўрока.
4. Форма ўрока.
5. Мэты гэтага ўрока і наступнага.
6. Хатняе заданне да наступнага ўрока, формы работы пры яго выкананні, рэкамендацыі.
7. Этапы ўрока і формы работы на ім.
8. Выхад на сістэму перспектыўных ліній:

а) да якіх крыніц (навуковых, мастацкіх, распрацаваных да ўрока метадычных і г. д.) могуць звяртацца вучні пры вывучэнні акрэсленай тэмы;

б) якім чынам будзе здзяйсняцца ў далейшым выхад на вывучаемы на гэтым уроку матэрыял;

в) формы кантролю за ўзроўнем засваення матэрыялу;

г) элементы эстэтычнай, выхаваўчай праграмы.

Адно з цэнтральных патрабаванняў да выкладання літаратуры па сістэме перспектыўных ліній — **цэласнае** (і ніяк не паэтапнае, з наступным абмеркаваннем прачытаных частак твора) **успрыманне вучнямі мастацкага тэксту.** У такім выпадку не рассейваюцца эмацыянальныя ўражанні, у выніку — ацэнка прачытанага, на грунце якой ствараюцца ўмовы для эстэтычнай асалоды ад спасцігнутага.

---

*Макарэвіч Аляксандр Мікалаевіч — старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры Магілёўскага педінстытута, настаўнік беларускай мовы і літаратуры класічнай гімназіі № 3 г. Магілёва. У 1990 г. закончыў аспірантуру пры Мінскім педагагічным інстытуце, кандыдат філалагічных навук. На працягу двух апошніх навучальных гадоў займаецца пытаннямі праблемнага выкладання беларускай літаратуры па сістэме перспектыўных ліній, праблемамі арганізацыі самастойнай работы студэнтаў філфакаў пры вывучэнні гісторыі беларускай літаратуры.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Практыка паказвае, што дасягнуць згоды ў гэтым настаўніку з класам цяжка, але магчыма, пры ўмове ўдалага перспектыўнага планавання ўрокаў. Галоўнае тут — разлічыць навучальны час, час самастойнай падрыхтоўкі вучняў і вольны канікулярны час такім чынам, каб вучні змаглі прачытаць неабходную літаратуру. Важную ролю пры гэтым адыгрывае **сістэма апераджальных хатніх заданняў**, элементы якой прадугледжваюць самастойную (на перспектыву) работу вучняў у вольны для іх час.

За аснову ў працэсе праблемнага выкладання па сістэме перспектыўных ліній у класічнай гімназіі № 3 г. Магілёва бралася праграма па беларускай літаратуры за 1992 г. Многія з яе раздзелаў змяняліся ў пагадзінным і структурным вызначэнні. Дарэчы, такі ж падыход прапаноўваецца і аўтарамі «Праграмы-праспекта па беларускай літаратуры...» [1].

На прыкладзе звароту да апісання працэсу выкладання некаторых тэм праілюструем, як практычна можна скарыстоўваць прапанаваную сістэму.

Даволі часта пры аналізе мастацкага твора вучні збіваюцца на пераказ яго зместу, пры характарыстыцы жыцця і дзейнасці пісьменніка — на пералічэнне (без каментараў, развbooжанняў) датаў жыцця і творчасці. Але ж гэтага недастаткова. Старшакласнік павінен ведаць не толькі змест мастацкага твора, агульнае ўяўленне пра творчасць пісьменніка, але і валодаць пытаннямі тэорыі літаратуры, умець дэманстраваць уменні і навыкі літаратуразнаўчага аналізу мастацкага твора. Прапаноўваемыя ніжэй схемы, думаецца, будуць спрыяць фармаванню ўменняў і навыкаў правільнага аналізу мастацкага твора і літаратурнай дзейнасці пісьменніка. Пры гэтым, аднак, неабходна ўлічваць наступныя алгарытмы працы, якія можна рэкамендаваць вучням:

1. Чытаючы мастацкі твор, паралельна працуйце з дзённікам чытача і рабіце туды запісы ў парадку, прапанаваным у прыведзенай ніжэй схеме № 1 (пункты 4—7).

2. Пасля прачытання твора пазнаёмцеся з рэкамендаванай для яго вывучэння крытычнай літаратурай, суаднясіце ўласныя назіранні з ацэнкамі літаратуразнаўцаў. Найбольш каштоўныя, на вашу думку, вывады выпішыце ў літаратурны сшытак, каб затым уласныя выказванні і разважанні пры адказе пацвердзіць больш аўтарытэтнымі ацэнкамі (пры гэтым неабходна абавязкова спасылацца на аўтара, назву ягонай працы).

3. Пасля выканання ўсяго раней адзначанага можна рыхтавацца да адказу па наступных схемах.

**Схема № 1**
кароткага літаратуразнаўчага аналізу мастацкага твора

1. Агульная характарыстыка гістарычных абставін, у якіх быў напісаны твор.

2. Якое месца займае твор у сістэме літаратурнай дзейнасці пісьменніка:

а) да якога перыяду ён адносіцца?

б) ці працаваў аўтар у час напісання гэтага твора над іншымі?

3. Звесткі аб:

а) даце першай публікацыі (для драматычнага твора — аб даце пастаноўкі на сцэне);

б) уплыве твора на свядомасць чытачоў, фармаванне грамадскай думкі;

в) ацэнках твора, яго ідэйнай накіраванасці ў сувязі з гістарычна-палітычнымі зменамі ў грамадстве.

4. Характарыстыка:

а) часу, падзей, якія апісваюцца ў творы;

б) персанажаў;

в) асаблівасцяў сюжэта, кампазіцыі, стылю твора;

г) праблематыкі, канфлікту.

5. Характарыстыка ідэйнага зместу твора.

6. Вашы асабістыя адносіны да мастацкага твора.

7. Прывядзіце прыклады ўрыўкаў з твора, у якіх ёсць пацвярджэнні вашым разважанням аб асаблівасцях кампазіцыі, стылю, аб філасофскай канцэпцыі аўтара.

8. Месца твора ў гісторыі нацыянальнай і сусветнай культуры.

**Схема № 2**
кароткай літаратуразнаўчай характарыстыкі жыцця і творчасці пісьменніка

1. Агульная характарыстыка гістарычнага перыяду, у які працаваў (працуе) пісьменнік.

2. Кароткія звесткі біяграфічнага характару аб аўтары.

3. Характарыстыка творчасці пісьменніка:

а) пачатак літаратурнай дзейнасці;

б) этапы літаратурнай дзейнасці;

в) мастацкія асаблівасці некаторых твораў.

4. Пісьменнік і грамадства:

а) сацыяльная пазіцыя мастака, ступень яго ўдзелу ў грамадскім жыцці;

б) якім чынам грамадска-палітычныя абставіны ўплывалі (уплываюць) на творчасць пісьменніка;

в) ці залежалі яго творчыя арыенціры ад палітычнай кан'юнктуры;

г) ступень уплыву твораў пісьменніка на фармаванне грамадскай свядомасці;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

д) ці мяняліся ацэнкі твораў у сувязі са зрухамі ў грамадска-палітычных абставінах.

5. Прывядзіце прыклады з твораў пісьменніка, якія пацвердзілі б вашы разважанні аб ягонай творчасці.

6. Вашы асабістыя адносіны да творчасці гэтага аўтара.

7. Значэнне дзейнасці пісьменніка для развіцця нацыянальнай культуры.

## ВЫВУЧЭННЕ ЛІТАРАТУРЫ Ў X КЛАСЕ *

I. Я. КУПАЛА. Лірыка. Паэмы «Тарасова доля», «Безназоўнае», трагікамедыя «Тутэйшыя».

### Прыкладнае перспектыўнае планаванне ўрокаў

1-ая гадзіна. Характарыстыка жыцця і творчасці Я. Купалы савецкага часу. Форма ўрока — лекцыя.

Асноўная мэта гэтага ўрока — **паглыбіць веды вучняў па творчасці паэта, даць новыя звесткі з жыцця і дзейнасці Я. Купалы, якіх няма ў школьным падручніку.**

Пры тлумачэнні хатняга задання да наступнага ўрока семінарскага тыпу мэтазгодна акрэсліць наогул структуру ўрокаў па вывучэнні творчасці Я. Купалы, іх мэты, формы работы, кантролю, выхад на сістэму перспектыўных ліній:

а) падрыхтоўка да калоквіума, сачынення;

б) назапашванне фактычнага матэрыялу для пісьмовай работы па лірыцы, паэмах Я. Купалы і М. Танка, выконваць якую вучні будуць у XI класе;

в) пачатковая падрыхтоўка да будучай творчай работы вуснага характару «Адлюстраванне рэчаіснасці 20-х гг. у трагікамедыі Я. Купалы «Тутэйшыя» і рамане А. Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя».

Мэтазгодна рэкамендаваць для прачытання і навуковую літаратуру, якая дапаможа вучням у падрыхтоўцы да ўрокаў па творчасці Я. Купалы [2]. Калі ў класе ёсць здольныя да самастойнай даследчай працы вучні, то ім можна параіць у якасці апераджальнай падрыхтоўкі да калоквіума, сачынення, вывучэння творчасці Я. Купалы, А. Мрыя дадатковую навуковую і мастацкую літаратуру [3].

* Лірычныя творы для вывучэння могуць быць вызначаны настаўнікам з улікам «Праграмы сярэдняй школы...», «Праграмы-праспекта па беларускай літаратуры...», даведніка для абітурыентаў, новых даследаванняў па творчасці Я. Купалы.

нный архив библиотеки МГУ имени А.А. К

Неабходна пры гэтым звярнуць увагу на такі арганізацыйны момант. Гэтыя рэкамендацыі, калі іх прапаноўваюць вучням пад запіс, забяруць шмат часу. Таму мэтазгодна крыху раней падрыхтаваць іх пісьмовы варыянт, каб пасля абвяшчэння яго раздаць у класе некалькі экземпляраў або прымацаваць, скажам, на стэндзе «Сёння на ўроку», каб вучні зрабілі адпаведныя выпіскі *.

2-ая гадзіна. Трагікамедыя **Я.** Купалы «Тутэйшыя». Гісторыя стварэння, публікацыі і пастаноўкі п'есы на сцэне. Літаратуразнаўчы аналіз твора. Форма ўрока — лекцыя з паралельнымі заданнямі **.

У якасці дапаможнай літаратуры настаўнік можа выкарыстаць ужо названую, а таксама іншую [4].

Каб не губляць час на запісванне інфармацыі, якую вучні могуць без цяжкасцяў знайсці ў названых для іх на папярэднім уроку крыніцах, настаўнік па ходзе лекцыі дае заданні аб канспектаванні некаторых высновай з адпаведных крыніц.

У якасці своеасаблівага вываду па гэтай лекцыі вучням можна прапанаваць наступныя разважанні.

У трагікамедыі «Тутэйшыя», як і ў дакастрычніцкіх творах, **Я.** Купала памастацку асэнсоўваў перспектывы грамадскага развіцця свайго краю. У грамадстве новага тыпу, у небяспечным яго зародку пісьменнік убачыў негатыўныя факты, з пашырэннем якіх беларусы крок за крокам будуць ісці да бездані, што можа прывесці іх да пагібелі. Небяспека не толькі ў тым, што зносакі, спічыні і да іх падобныя асобы могуць, дарваўшыся да ўлады, прадвызначаць лёс бацькаўшчыны. Небяспека ў тым, што людзей, якія могуць процістаяць ім, няшмат. А тыя, хто маглі б гэта зрабіць, застаюцца праўдашукальнікамі-ідэалістамі. У гэтым сэнсе вобраз Янкі Здольніка, думаецца, мэтазгодна ацэньваць як **вобраз-ідэю** і як **вобраз-папярэджанне.** Янка, захоплены ідэяй асветніцтва ў вёсцы, не надае сур'ёзнага значэння амбіцыйнасці Зносака. Сярод усіх дзеючых асобаў п'есы Янка — адзіны, хто мог бы хоць нейкім чынам стаць на шляху Мікіты. Але такое не адбываецца. У гэтым сэнсе, думаецца, Купала паглыбіў праблему вобраза-папярэджання, да адлюстравання якой ён звяртаўся ў сваіх дакастрычніцкіх творах («Раскіданае гняздо» — вобразы Данілкі, Зосі, «Магіла льва» — вобраз Натальні і інш.).

У сувязі з названымі вывадамі нельга не звярнуцца яшчэ раз да сутнасці назвы п'есы, яе ідэйнага гучання. У ёй бачыцца даволі значны ідэйны падтэкст: беларусы ў палітычных адносінах застаюцца пакуль што менавіта тутэйшымі: народам, у абазначэнні якога («тутэйшыя») хаваецца недасканаласць духу, няспеласць нацыянальных памкненняў. Разважлівасць, спагадлівасць і ўсецярпімасць тутэйшага люду — якасці выдатныя, але недастатковыя для таго, каб вывесці на шлях сапраўднай незалежнасці: ад расейскай (польскай, нямецкай) улады, ад бязглуздых ідэй, ад дурасці сваіх жа, мясцовых, асэсараў і «саўбураў». І не дзіва, што ў фінале п'есы, калі прадстаўнік новай улады заяўляе Мікіту, што квіток на ягоны арышт зробяць пасля, трагічнае ўзмацняецца, гучыць на поўны голас. І ў гэтым факце бачыцца своеасаблівае прадказанне Купалам лёсу сваіх суайчыннікаў: наперадзе іх чакае жыццё з афармленым не па правілах квітком на арышт.

Нездарма п'есу напаткаў такі трагічны лёс. За крытыкай асобнага відавочнага была ў творы крытыка больш значнага, істотнага: грамадства і ўлады, якія дазваляюць квітнець дурноце, бязглуздзіцы, прыстасавальніцтву. Караючы адно зло, новая ўлада нараджала яшчэ большае (успомнім фінал твора). Гэтыя і іншыя падтэксты трагікамедыі, а ў часе пастаноўкі на сцэне яны маглі набываць выключную выразнасць, былі, вядома, непажаданымі для афіцыйных уладаў. Яны пралівалі святло не толькі на рэчаіснасць пачатку 20-х, але і на падзеі ўсіх наступных гадоў.

*Працяг будзе.*

---

* Хатняе заданне можа быць наступным:

а) вывучаць матэрыял падручніка і лекцыі па гэтай тэме, зрабіць неабходныя запісы і дадаткі ў літаратурны сшытак;

б) у адпаведнасці з апераджальным заданнем папярэдніх урокаў закончыць чытаць трагікамедыю;

в) прачытаць даследаванне Б. Сачанкі «Сняцца сны аб Беларусі...».

** Тут і далей, каб пазбегнуць паўтораў, не прыводзім апісанне хатніх заданняў. Іх можна вызначыць, калі зыходзіць са зместу наступных ўрокаў; настаўнік павінен сачыць за стадыяй чытання і завучвання твораў на памяць.

---

[1] Праграма-праспект па беларускай літаратуры для VII—XI класаў сярэдняй школы // Роднае слова. 1992. № 6.— С. 37.

[2] **Сабалеўскі А.** Аб п'есе «Тутэйшыя» // Полымя. 1988. № 9.— С. 13—18; **Каваленка В.** Эпічная сіла паэтычнага слова / Купала Я. Паэмы. Драматычныя творы.— Мн., 1989.— С. 486—493; **Тарас В.** Предисловие переводчика // Неман. 1989. № 7.— С. 8—9.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[3] **Семяновіч А.** Янка Купала / Гісторыя беларускай савецкай драматургіі. 1917—1955.— Мн., 1990.— С. 47—59; **Грахоўскі С.** Праўдзівыя дакументы жыцця // Полымя. 1988. № 1.— С. 127—128; **Шашалевіч А.** Другу працоўных Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну // Полымя. 1988. № 1.— С. 128—133; **Мрый А.** Запіскі Самсона Самасуя // Полымя. 1988. № 1.— С. 133—163; № 2. С. 119—148, або: **Мрый А.** Творы.— Мн., 1993; **Купала Я.** Паэмы. Драматычныя творы.— Мн., 1989.— С. 409—483; **Купала Я.** Тутэйшыя. Трагічна-сьмяшлівыя сцэны ў 4-х дзеях // Полымя. 1988. № 9.— С. 19—62; **Сачанка Б.** «Сняцца сны аб Беларусі...» Загадка смерці Янкі Купалы. / **Сачанка Б.** Сняцца сны аб Беларусі... Літ. крытычныя арт., інтэрв'ю.— Мн., 1990.— С. 157—182, альбо: **Сачанка Б.** «Сняцца сны аб Беларусі...» Загадка смерці Янкі Купалы // Літаратура і мастацтва. 1988. 19 жніўня.

[4] **Васючэнка П.** Загадкавыя «Тутэйшыя» // Літаратура і мастацтва. 1989. 19 мая; **Купала Я.** Незалежнасць // Спадчына. 1990. № 2.— С. 14—15; **Купала Я.** Справа незалежнасці Беларусі за мінулы год // Спадчына. 1989. № 2.— С. 22—23; **Марціновіч А.** Цікавыя людзі мы — беларусы // Літаратура і мастацтва. 1990. 2 лютага; **Семяновіч А.** Ля вытокаў савецкай камедыяграфіі // Полымя. 1989. № 8.— С. 198—205; **Сідарэвіч А.** Тутэйшы трагіфарс // Літаратура і мастацтва. 1990. 26 кастрычніка; **Сцяжко Н.** Абразліва звацца тутэйшымі // Літаратура і мастацтва. 1990. 13 ліпеня.

*Ад рэдакцыі.* Раім звярнуцца да матэрыялаў, змешчаных у нашым часопісе: **Васючэнка П.** Рэпрэсіраваны смех // **Беларуская** мова і літаратура ў школе. 1989, № 3.— С. 38—42. **Марціновіч А.** Думаў пра шчасце Беларусі // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1990, № 10.— С. 66—69. **Мушынская Т. Я.** Я — сучасны чалавек // Роднае слова. 1992. № 11.— С. 6—19.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова